№ 19 (48) Аўторак 14-га чэрвеня 1927 г. м. Вільня. Год II.

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА

Выходзіць раз у тыдзень — Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае а[…]ная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці. — Шырокі дэмакратызм.[…] Нацыянальная царква. Краевая згода. — Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная […]
„ […]
Заграніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвят.ў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр
„ сярод тэксту —25 гр.
„ на апош. стар.—10 гр
за радок нонпарэля.

Wilno
Uniwersytecka 9
„Przegląd Wil."

БЕЛАРУСЫ — ВЫБАРШЧЫКІ!

Паводле абавязуючага Закону аб гмінных самаўрадах, у межах дзеяльнасьці гміны, як самаўрадавай адзінкі, уваходзяць справы: асьвэты, падаткавыя, апекі над беднякамі, ахова грамадзкага здароўя, будова дарог, мастоў, справядлівага падзелу павіннасьцяў, забясьпечаньня насельніцтву мэдыцынскай дапамогі, разьвіцьце культуры земляробства, разьвіцьце гандлю, прамысловасьці, рамёслаў, коопэрацыі і г. д. І калі дагэтуль у гэтых галінах сялянскага жыцьця была блага; калі сялянства цярпела крыўды ад несправядлівасьцяў падзелу падаткаў і павіннасьцяў; калі не магло дабіцца сваей роднай школы; калі мазольны грош яго ня йшоў на патрэбы яго жа,—дык гэта выключна была вынікам таго, што у гмінных дасюлешніх самаўрадах сялянства нашае не было у адпаведным ліку прадстаўлена, НЯ МЕЛА БОЛЬШАСЬЦІ, а тыя, хто прадстаўляў яго ў самаўрадах, або ня мелі неабходнай цьвёрдасьці і сьвядомасьці сваіх абавязкаў, або нічога супольнага па духу з беларускім сялянствам ня мелі.

І вось важнейшай, галоўнай задачай нашай цяперака павінна быць: правядзеньне у гмінныя Рады большага ліку сваіх прадстаўнікоў і пры тым —

ЛЮДЗЕЙ ЦЬВЕРДЫХ, ЧЭСНЫХ, ЦЬВЯРОЗЫХ, НАЦЫЯНАЛЬНА СЬВЯДОМЫХ і ПРАЦАВІТЫХ.

Заданьнем самаўрадаў ёсьць ПРАКТЫЧНАЯ ПРАЦА над аздараўленьнем жыцьця вёскі.

У самаўрадзе не павінна быць нейкай „высокай палітыкі“. Гэта не трыбуна для палітычных гарлапанаў.

Увядзеньне у гмінныя Рады палітыканаў зьвядзе усю працу на гучныя выступленьні „праграмнага“ зьместу, зробіць з Рады палітычную гаварыльню. Калі-ж яшчэ пападуць туды „палітыкі“, ды яшчэ розных партыяў, а асабліва прыхільнікі будовы розных „раяў“ на зямлі, аматары „міровой рэвалюцыі“ ды „прэлітары ўсіх краёў“ дык Рада гмінная абярнецца у месца, дзе заместа штодзеннай, шэрай, але паважнай па сваему значэньню працы — пачнуцца спрэчкі, партыйная грызьня, вечная нязгода.

І вось, каб гэтага ня было, пры выбарах трэба па магчымасьці абмінаць гэткіх „палітыкаў“, а асабліва — партыйцаў.

Зразумела, што яны будуць старацца прайсьці у Рады. Зразумела, што для гэтага яны будуць салодка пяяць, разсыпацца у выражэньнях асаблівай любві „да народу“, і руплівасьці аб ім, будуць сыпаць шчодрымі абяцанкамі.

Але браты! Памятуйце, што шчодрыя пасулы — гэта проста дэмагогія! Суліць МОЖНА ТОЛЬКІ ТОЕ, ШТО МОЖНА ДАЦЬ. Калі нельга даць — пасула ёсьць мана, ашуканства. Хто шчодры надта у абяцанках, так і знайце — маніць вас! Не дарма прыслоўе кажа: абяцанка — цацанка, а дурному радасьць.

Ня ідзіце-ж на спакусу пекных слоў і абецанак! Разгледайцеся вокал. Выбірайце ня тых, хто асабліва крычыць, ды сыплець вязкі пекных слоў і абяцанак, але сапраўды чэсных працаўнікоў.

Асабліва не выбірайце партыйцаў. Партыя,— гэта толькі пэўная частка грамадзянства яна бароне інтэрэсы толькі гэтай часткі, г. зн. сваёй партыі.

ПАНАД УСЯКІМІ ПАРТЫЯМІ — ПАВІННА СТАЯЦЬ НАЦЫЯ, НАРОД.

І дзеля гэтага, ідучы на выбары, адкіньце усякую партыйнасьць, усякія аддзельныя програмы, а памятуйце толькі аб тым, што вы — НАЦЫЯ, НАРОД.

Дык прэч з палітыканамі і партыямі!

Усе шчырыя, чэсныя, сумленыя беларусы; усе, каму на сэрцы ляжаць патрэбы і інтэрэсы нашага сялянства; усе, хто на мандат у Радныя будзе глядзець, як на АБАВЯЗАК перад выбраўшым яго народам і шчыра хоча выпаўніць гэты абавязак, — УСЕ ПАВІННЫ САБРАЦЦА ПАД НАЦЫЯНАЛЬНЫМ СЬЦЯГАМ, ісьці кандыдатамі ПА БЕЛАРУСКАМУ НАЦЫЯНАЛЬНАМУ СЬПІСКУ!

А усе тыя, хто хоча, каб новы гмінны самаўрад выпаўніў добра свае заданьні і сапраўды працаваў у імя інтэрэсаў нашае вёскі і мнагапакутнага нашага сялянства.—

ПАДАВАЙЦЕ ГАЛАСЫ ЗА КАНДЫДАТАЎ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА СЬПІСКУ!

Памятуйце беларусы, што толькі ідучы дружна, згодна, валам, не разьбіваючы свае галасы аддачай іх на некалькі сьпіскаў, а галасуючы толькі НА АДЗІН мы ДАБ'ЕМСЯ БОЛЬШАСЬЦІ і гэткім чынам, ГАСПАДАРЧАЕ ЖЫЦЬЦЕ ВЕСКІ БУДЗЕ Ў НАШЫХ РУКАХ!

Дык усе, як адзін, галасуйце на агульна НАРОДНЫ - БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ СЬПІСАК!

Цэнтральны Беларускі Нацыянальны Выбарны Камітэт на Віленшчыму і Наваградчыну.

Ад Цэнтральнага Камітэту.

Па выбарам у Гмінныя Самаурады.

Цэнтральны Беларускі Нацыянальны Выбарны Камітэт паведамляе грамадзян бяручых ўдзел у выбарах, што за ўсімі спраўкамі, высьненьнямі і літэратурай па выбарам належыць зварачвацца да галоўна-уповажняных і інструктараў, якія з дня 6 чэрвеня выехалі на провінцыю і знаходзяцца на сваіх раёнах. А ласьне:

Галоўна-ўповажняны Тодар Вярнікоўскі — пав. Малодэчанскі, Вілейскі і Валожынскі. **Уповажняныя.** 1) Мацей Пятровіч — Маладэчанскі, Ашмянскі і Валожанскі 2) Уладзімір Гарбун і 3) Уладз. Дзежыц — абыдва на паветы Слонімскі і Наваградзкі, 4) Ян Яраш, 5) Тодар Шыбут — абыдва на павет Нясьвіжскі 6) Нікадым Кернажыцкі 7) Абрамчык — на павет Баранавіцкі, 8) Канст. Маеўскі — на павет Лідзкі, 9) Якуб Нехвядовіч — гміна Лебедзеўская і Беніцкая, 10) Мар'я Станкевічанка — гміны Вішнеўская, Юрацiская, Лугавіцкая і Ліпнішская.

Інструктары — на паветы Маладэчанскі, Ашмянскі, Валожынскі і Вілейскі

1) Ал. Дзеніс.
2) Ст. Гарцуновіч.
3) Мак. Белан.
4) Бас. Грыб.
5) Апан. Чапенка.
6) Ян Бурас.
7) Баз. Юрэвіч.
8) Ян Дзеніс.
9) Пётр Божко.
10) Юз. Сакалоўскі.
11) Ян Сьвірскі.
12) Мік. Харашэвіч.
13) Мак. Сенько.
14) Андр. Ано .
15) Нічып. Сіняўскі.
16) Алекс. Сауловіч.
17) Алек. Шаломскі.
18) Ян Ярмаковіч.
19) Дзьм. Зенкевіч.
20) Паўл. Шафаловіч.
21) Ант. Страх.
22) Анд. Балаш.
23) Марц. Саковіч.
24) Ян Лукашык.
25) Мік. Усьціновіч.
26) Сым. Курыла.
27) Конст. Стэфановіч.
28) Анд. Карабкоў.
29) Сярг. Татаровіч.
30) Андр. Карніцкі.
31) Мік. Ульчыц.
32) Базылі Моклы.
33) Андрэй Чэрняўскі.
34) Мік. Мяцеліца.
35) Еўг. Чэрняўская.
36) Мік. Уласэвіч.

На паветы Наваградзкі і Слонімскі.

37) Ал. Лазоўскі
38) Міх. Бобрукевіч.
39) Мік. Сусоін.
40) Конст. Губар.
41) Тод. Лішык.
42) Ян Гародка.
43) Ян Саўка.
44) Мік. Кашка.
45) Еўг. Акуновіч.

Аб рэшце інструктараў будуць дадзены паведамленьні дадаткова.

Цэнтральны Беларускі Нацыянальны Выбарны Камітэт
месьціцца у ВІЛЬНІ Завальная вул. д. № 6 кв. 4.
Адчыняны што дня ад 10 да 15 гадзіны.

Палітычны агляд.

Англійска-бальшавіцкі канфлікт з кожным днём прыймае ўсё большыя памеры. Пры гэтым характэрна тое, што ў той час, як бальшавікі праяўляюць крайнюю нэрвовасьць, крычаць аб пагражаючай вайне, Англія зусім спакойна вядзе сваю акцыю. Англійскія міністры заявілі ў парлямэнце, што бальшавікі могуць і далей гандляваць з Англіяй, калі хочуць, але толькі на аднолькавых варунках з усімі іннымі гэта значыць, што бальшавіцкія гандлёвыя дэлегацыі ня могуць карыстацца правам экстэррытарыяльнасьці, як дыплёматычныя прадстаўнікі Англія заўсёды гатова гандляваць з бальшавікамі, але не пазволіць ім пад відам гандлю займацца шпіёнажам. Англіі абрыдла, нарэшце, зносіць у сябе прытон бальшавіцкіх шпіёнаў і агітатараў. У яе рашучы тон адносна бальшавікоў

знайшоў водгук і у другіх дзяржавах.

Бальшавікі думалі запужаць англійскіх капіталістаў тым, што перададуць Амэрыцы заказы, вызначаныя для Англіі. Але і Амэрыка ня вельмі хваліцца па прыязьнь з бальшавікамі. Каб яны ня мелі вялікай падзеі на Амэрыку і не шантажыравалі гэтым, амэрыканскі пасланнік у Парыжу выступіў з афіцыяльнай прамовай, у якой выразна акрэсьліў пазыцыю Амэрыкі. Ен адкрыта назваў

радавы Урад „бандыцкім“,

і дадаў, што Амэрыка не пазволіць гэтым „бандытам“ атручываць свой народ атрутаю камуністычнага вучэньня. Гэткая шчырасьць Амэрыкі яканчальна вывяла бальшавікоў з душэўнае роўнавагі. Бальшавіцкія газэты проста шалеюць ад злосьці. Новыя масавыя дэмонстрацыі пратэстаў, новыя пагрозы пратэсту проці гэткага „нетактоўнага“ выступленьня амэрыканскага прадстаўніка. Але усё гэта мае сваею мэтаю толькі супакоіць уласных грамадзян, а не запужаць Заход.

Цяпер спасьцярагаецца гэтакае самае зьявішча, як у часе вайны з Нямеччынай, калі адна дзяржава за другою прылучаліся да хаўрусьнікаў і абвяшчалі вайну немцам. Абвяшчалі вайну нават такія дзяржавы, як сярэдня-амэрыканскія рэспублікі, якія фактычна нават не прыймалі ўдзелу у вайсковых апэрацыях па сушы ці моры. Яны мусілі пад націскам Англіі і Амэрыкі паказаць, з кім яны больш салідарызуюцца з двух варожых бакоў з „тройственнай згодай“, ці з вероломнымі тэўтонамі. Гэтак сама і цяпер за прыкладам Англіі пайшлі Канада, Аргэнтына, рыхтуецца да зрыва дыплёматычных зносін з бальшавікамі Літва і іншыя.

Увесь Заход арганізуецца проці бальшавізму.

Усе спробы бальшавікоў пасварыць між сабою заходнія дзяржавы шляхам розных інтрыгаў і абацянак пацярпелі поўны крах. Візыта Чычэрына у Парыжу не дала ніякіх вынікаў. І ён зусім змучаны маральна і фізычна ізноў пацягнуўся да Бадэн-Бадэна з мэтаю спаткацца з Штрэзэманам, адзіным абаронцаю. Але і роля гэтага апошняга цяпер вельмі затруднена ня толькі на міжнарадовым тэрэні, але нават у сябе дома. Бэрлінскія газэты прапануюць Чычэрыну лепей устрымацца ад усялякіх афіцыяльных гутарак з прадстаўнікамі прэсы, дзеля таго, што гэта можа толькі зашкодзіць агульнай справе. І наагул

Бэрлін ня менш заклапочан, чым Масква.

З аднаго боку немцы ня могуць адмовіцца ад рапальска бэрлінскага хаўрусу, а з другога яны бачаць, як пад іх нагамі пачынае хістацца лёкарнскі грунт. Варта толькі Амэрыцы пад націскам Англіі устрымаць немцам далейшыя пазыкі, як курс нямецкае маркі пры бязупынным пассыўным гандлёвым балянс зноў можа паляцець у процьму. На бэрлінскай біржы ўжо другі раз пачынаецца паніка. Штрэзэман хутка выедзе на звычайную сэсію Рады Лігі Народаў і Чычэрын жадае выкарыстаць яго для сваіх мэтаў у Жэневе. Але вельмі няпэўна, ці пашанцуе бальшавікам направіць міжнарадовую палітычную сытуацыю, якая злажылася вельмі некарысна для Масквы. Гэта відаць з таго, што нават у радах расейскай камуністычнай партыі пачалася грызьня.

Апазыцыя, на чале якой стаіць Троцкі і Зінаўеў, ізноў падняла галаву.

Апазыцыя быццам чакала толькі на усе вонкавыя непрыемнасьці для радавага Ураду, каб пачаць новую барацьбу з Сталіным і яго прыхільнікамі у камуністычнай партыі. Лёнданскія падзеі соўпалі як раз з агульным зьездам выканаўчага камітэту камінтэрна, які цягнуўся ад 18 да 30 траўня. На гэтым зьезьдзе абгаварываліся кітайскае пытаньне, пытаньне аб сьвятовай рэвалюцыі, зрыве англійска-радавых зносінаў быццам пагражаючай небясьпецы вайны. Наогул

бальшавікі увесь час крычаць аб пагрозе вайны,

каб гэтым з аднаго боку запужаць апазыцыянэраў і падтрымаць унутраную згоду ў камуністычнай партыі, а з другога боку ўплынуць на сьвятовы пралетарыят, ведаючы добра, што вайна цяпер непапулярна ў Заходняй Эўропе. Раздзьмухаючы чуткі аб магчымасьці вайны, бальшавікі думаюць гэткім чынам выклікаць замешкі сярод Заходня-Эўрапэйскіх працоўных і уняшкодзіць для сябе агульна-эўрапэйскі антыбальшавіцкі блёк Але вельмі грубымі чорнымі ніткамі па беламу шыецца бальшавіцкая палітыка, каб ня можна было заўважыць усей ілжы і крывадушша бальшавіцкай дыпломацыі. Увесь сьвет пераканаўся, што ніхто ня хоча вайны апрача бальшавікоў, якую яны потым перакшталціл-бы ў сацыяльную. І гэты фальш бальшавікоў адкрыў Троцкі на зьездзе пленума камінтэрна. Ён заявіў, што галоўныя сілы трэба скіраваць не проці імпэрыялістаў падбухторываючых да вайны але проці

„небясьпечнейшай з усіх небясьпек, якой зьяўляецца партыйны рэжым.

Троцкі вінаваціў камінтэрн у кітайскай „афэры“, ўбязцэльнасьці і бязскутэчнасьці заграчнічнай агітацыі і г. д. Лідар петраградскіх апазыцыянэраў Еўдакімаў заявіў, што „бальшавікі вельмі вялікую ўвагу зварачываюць на вонкавыя фронты, забываючы ўнутраны, дзе ужо

стварыўся вялікі прарыў, зьявіўшыся вынікам уздымаючагася недаверра да

ЗАБОЙСТВА ВОЙКАВА.

Забойства Радавага пасланніка Войкава у Варшаве.

7 чэрвеня а гадзіне 9 рана ў Варшаве на галоўным вакзале быў замардаваны савецкі пасланнік Войкаў пры наступных абставінах. Войкоў прыехаў на пасольскім аўтамабіле на вакзал для спатканьня з выгнанным з Лёндана савецкім паслом Розэнгольцэм. На пэроне Вайкоў з Розэнгольцэм нейкі час гулялі, узяўшысь пад рукі і ціха гутарылі. Калі бальшавіцкія дыплёматы падыйшлі да вагону, у якім мусіў ехаць да Масквы Розэнгольц, да іх прыблізіўся нейкі малады хлапец у чорнай вопратцы і спартовай шапцы і сказаў некалькі слоў, зьвяртаючыся да Войкава. Пасьля адступіў некалькі крокаў назад, махам выняў рэвальвэр і скірагаў яго ў Войкава, зрабіў 6 выстралаў адзін за другім, сказаўшы: „згінь за Расею“. Першыя дзьве кулі трафілі ў грудзь Войкава. Ранены пасьпеў вынуць рэвальвэр з задняй кішэні і зрабіць некалькі выстралоў у нападаўшага, але прамахнуўся. Пасьля, зрабіўшы некалькі крокаў у кірунку вакзала і апіраючыся на вагон, упаў на зямлю.

Выпусьціўшы ўсе кулі, забойца аддаў рэвальвэр падскочыўшым да яго паліцыянтам. На пытаньне паліцыянта, што зрабіў, атказаў: — гэта была мая помста за Расею, за мільёны людзей. Арыштаванага забойцу адвялі спачатку да жалезна-дарожнага камісарыяту, а пасьля пад сільнай вартай да турмы на Дзельнай вуліцы.

КІМ БЫУ ЗАБОИЦА ВОЙКАВА.

Арыштаваны забойца Войкава назваў сябе Барысам Кавэрдаю, пражываючым у Вільні на вуліцы Крывое Кола, 4. Пры дапросе Кавэрда прызнаў сябе бел-русом і заявіў, што забіў Войкава з ідэовых пабудкаў, роўным чынам на грунце асабістых разрахункаў, бо яму было адмоўлена ў візе на выезд да Расеі.

СЬМЕРЦЬ ВОЙКАВА.

Перавезяны да шпіталя Войкаў памёр праз поў гадзіны у часе аперацыі ад кровазьліянія ў лёгкіх. Перад сьмерцью Войкаў прышоў да прытомнасьці і зьвярнуўся да сэкрэтара пасольства з жаданьнем, каб забраў паперы знаходзячыяся пры ім і ключ ад касы. У 2 гадзіне дня труп яго быў перавезен да Пасольства, адкуль а 10 у пятніцу будзе адпраўлен да Масквы у саправаждзеньні Розэнгольца і сэкрэтара пасольства Маркацьева.

КАМУНІКАТ САВЕЦКАГА ПАСОЛЬСТВА.

У камунікаце, аб'яўленым вечарам савецкім пасольствам, гаворыцца, што тэлеграма аб прыбыцьці Розэнгольца ня была зашыфрована і што аб атрыманай тэлеграме ведалі толькі бліжэйшыя акружаючыя пасланніка. Адсюль вынікае, што забойца быў загадзя паінфармаваны. Далей пасольства С.С.Р.Р. выразіла жаданьне, каб яго прадстаўнік прыймаў удзел пры дапросе віноўнага. Міністар заграічных справаў абяцаў далажыць аб гэтым міністру юстыцыі. Затым прадстаўніцтва С.С.Р.Р. паведаміла свой ўрад у Маскве, ад якога чакае інструкцыяў.

ПОЛЬСКІЯ УЛАДЫ ПРАПАНАВАЛІ ВОЙКАВУ АХРАНУ.

Польскія ўлады ў свой час прапанавалі ахрану асабістай небясьпекі Войкаву з боку польскіх органаў бясьпечнасьці, але Войкаў катэгарычна адхіліў гэту прапазыку. Савецкае пасольства ніколі не паведамляла польскія органы бясьпечнасьці аб выездах сяброў пасольства, ці праездах праз Варшаву бальшавіцкіх саноўнікаў. У даным выпадку Польскія Ўлады ня былі паінфармаваны аб праездзе Розэнгольца і выездзе на спатканьне да яго Войкава, а дзеля гэтага і нямогуць узяць на сябе адказнасьці за здарыўшыся выпадак.

КОНФЭРЭНЦЫІ.

Пасьля паўдня і вечарам адбыўся цэлы рад конфэрэнцыяй між міністрам заграічных справаў Залескім, віцэ-прэм'ерам Бартэлем, міністрам унутраных справаў Складкоўскім і інш.

СПАЧУЦЬЦЕ.

Прэзыдэнт Рэспублікі выслаў Старшыне Цэнтр. Выканаўчага Камітэту С.С.Р.Р. тэлеграму з выразам спачуцьця з поваду пакушэньня на асобу дыплёматычнага прадстаўніка. Гэткую-ж тэлеграму выслаў міністар заграічных справаў камісару заграічных справаў С.С.Р.Р.

Біаграфія Войкава.

Пётр Войкаў радзіўся у 1888 г. у Кэрчы (Крым). Ў 1903 г. прыймаў удзел у рэвалюцыйным руху, а у 1907 г. эміграваў за граніцу, спачатку да Парыжа, а пасьля да Жэнэвы, дзе паступіў да унівэрсытэту. Калі ў Расеі выбухла рэвалюцыя, Войкаў разам з Леніным і іншымі праехаў праз Нямеччыну ў Расею.

У часе кастрычнікавай рэвалюцыі ён працаваў у Экатэрынбургу, будучы камісарам па спажыўнасьці і сябрэм акружнага выканаўчага камітэту і прыймаў удзел у вымардаваньні царскай сямьі. Пасьля быў назначан у цэнтральны камітэт профэсыянальных саюзаў, дзе займаў пасаду віцэ старшыні і сябра калегіі Ўнешторга і мяснога трэста. Затым быў вызначаны старшынёю расейска-украінска-польскай эвакуацыйнай камісіі, а у кастрычніку 1924 г. быў вызначаны на пасаду радовага прадстаўніка ў Варшаве.



ПЕТР ВОЙКАЎ

НОТА С. С. Р. Р. ПОЛЬШЧЫ.

Заступнік маскоўскага камісара заграічных справаў Літвінаў зьвярнуўся да Польшчы з нотаю наступнага зьместу: „Радавы урад толькі што атрымаў па тэлеграфу вестку аб забойстве расейскім манархістам прадстаўніка С. С. Р. Р. у Польшчы Войкава. Хаўрусны Урад ставіць гэта праступленьне ў сувязь з цэлаю сэрыяй актаў, скіраваных да зьніштажэньня дзейнасьці прадстаўнікоў С. С. Р. Р. заграніцаю і творачай прамую пагрозу міру. Напад на пэкінскае пасольства С. С. Р. Р., асада консульства у Шанхаі, паліцэйскае нападзеньня на гандлёвую дэлегацыю ў Лёндыне, правакацыйны разрыў дыплёматычных зносін з боку Англіі—Увесь гэты рад актаў разьвязаў дзейнасьць тэррорыстычных групаў рэакцыянэраў у сваей сьляпой ненавісьці да рабочай клясы хапаючыся за аружжа палітычных забойстваў. Хаўрусны урад бачыць у забойстве свайго прадстаўніка гэтак сама і вынік непрыняцьця польскім урадам усіх неабходных сродкаў проці праступнай дзейнасьці на тэрыторыі Польшчы расейскіх контр-рэвалюцыйных арганізацыяў, асабліва небясьпечных для міра ў цяперашней напружанай міжнарадовай сытуацыі. Хаўрусны Урад у свой час зьвяртаў ўвагу польскага ўраду на на тэррорыстычную дзейнасьць і колькі разоў папераджаў польскі урад аб магчымасьці правакацыйнай дзейнасьці з боку гэтых элемэнтаў і дзеля гэтага заяўляе свой рашучы негадуючы пратэст; лічачы, што польскі урад ня можа ухіліцца ад адказнасьці за здарыўшаеся, хаўрусны ўрад застаўляе за сабою права зьвярнуцца да пытаньня пасьля атрыманьня больш падрабязных вестак аб здарыўшайся ў Варшаве збродні.

Адказ Польшчы на ноту С. С. Р. Р.

Польскі пасланнік у Маскве даручыў Камісару Заграічных Справаў ноту Польскага Ураду наступнага зьместу:

„У адказ на ноту п. Камісара ад 7 чэрвеня маю гонар па даручэньню майго Ураду заявіць наступнае: Польскі Ўрад, глыбока ўзварушаны і абураны фактам агіднага забойства, ахвяраю якога паў пасланнік С.С.Р.Р. у Польшчы Пётр Войкаў, жадае яшчэ раз даць выражэньня пачуцьцям, якія у ім узварушыў факт гэтага забойства. Польскі Ўрад тым болей хварэе над чынам непачытальца ня польскай нарадовасьці, бо заўважывае палепшэньне палітычных адносінаў між Польскім Урадам і Ўрадам С.С.Р.Р., у чым шмат памог пакойны пасланнік Войкаў. Дзеля гэтага польскі Урад ня можа прызнаць сувязі між указанамі у ноце п. Народнага Камісара выпадкамі і фактам зробленага на тэрыторыі Польшчы забойства асобаю ня польскай нацыянальнасьці і з крыўдаю для польскай дзяржавы, фактам, які Польскі урад і апінія катэгарычна асудзілі. Польскі Ўрад, апіраючыся на міжнародныя звычаі давал прытулак палітычным эмігрантам рожных нацыянальнасьцяў, тым ня меней заўсёды перашкаджаў і не дапускаў на Польскай тэрыторыі якой-небудзь плянавай акцыі, скіраванай проці каго небудзь з інастранных дзяржаваў. Дзеля гэтага Польскі Урад ня можа лічыць сябе адказным за праступак, які, як паказала першае сьледства, зьяўляецца актам індывідуальнага характару.

Польскі Ўрад тым болей ня прызнае сябе адказным, што ў свой час прапанаваў прадстаўніку С.С.Р.Р. асабістую ахрану, ад якой пасл. Войкаў адмовіўся. Дзеля гэтага, ня прыймаючы на сябе адказнасьці за факт забойства, аднака з увагі на тое, што факт гэты меў мейсца на тэрыторыі польскай дзяржавы, Польскі Ўрад гатовы ёсьць разглядзець найпрыхільней магчымыя жаданьня С.С.Р.Р. адносна вынаграджэньня сямьі пасл. Войкава, калі толькі яна гэтага пажадае.“

Падзяка Літвінава.

Міністар Заграічных Справаў п. Залескі атрымаў ад замясьціцеля Чычэрына Літвінава тэлеграму наступнага зьместу: „прыйміце, пане Міністар і перадайце польскаму Ўраду падзяку майго Ураду за выражэньня спачуцьця па поваду забойства прадстаўніка Польшчы Войкава.

А Р Ы Ш Т Ы.

У зьвязку з забойствам Войкава ўлады грамадзянскай небясьпекі зрабілі цэлы рад, вобыскаў і арыштаў сярод расейскай калёніі у Варшаве і Вільні. У Варшаве было арыштавана 7 асобаў, у Вільні — 24. Пасьля дапроса амаль ня ўсе арыштаваныя былі звольнены. Гэтак сама былі зроблены арышты у Горадні, Беластоку, Брэсьці, Дубне і іншых мейсцах. Арышты датыкаліся галоўным чынам асобаў з правымі палітычнымі пераканаsuccessionнямі.

ВОЙКАУ БЫУ ЖЫД.

Варшаўская жыдоўская часопісь „Момэнт“ сверджае, што Войкаў быў жыд па свайму пахаджаньню. У часе перевозкі яго трупа на вакзал для атпраўкі да Масквы за хаўтурнай працэсыяй йшлі два жыдоўскія катафалкі, прысланныя жыдоўскаю хаўтурнаю арганізацыяй „Апошняя помач“.

радавай улады з боку рабочай клясы і сялянства.

Вось гэту брэш трэба перш-на-перш зьліквідаваць, што не прыймаецца пад увагу большасьцю кіруючага цэнтральнага воргану, усе яшчэ стараючагася патаргавацца з апазыцыяй, забываючы, што кожнае прамядленьня пагражае нязьлічынымі вынікамі выявіўшагася небясьпечнага для камуністычнай партыі прарыва ў пралетарскіх масах“.

Нямецкія газэты, заўсёды добра паінфармованыя ў маскоўскіх падзеях, паведамляюць, што цяперашняе выступленьне Троцкага, якое адкрыта падтрымліваецца Радэкам і Вуйёвічам, лічыцца ў дзесяць разоў мацнейшае, чым усе папярэднія выступленьні Зіноўёва. Троцкі стаіць на чале вельмі моцнага апазыцыйнага блёку. Апазыцыя гэта цьвёрда рашыла, ня гледзячы на ўсе спробы заткнуць ей рот, далей вясьці барацьбу да апошняй крайнасьці. Троцкі адкрыта заявіў на зьездзе, што

„будзе да канца вясьці барацьбу проці цяперашняга курсу“.

Ужо самы факт гэткага сьмелага выступленьня Троцкага, які у мінуўшым годзе прынёс пакутаваньне перад Сталіным, сьведчыць, што бальшавікі знаходзяцца на вулкане, які можа выбухнуць у кожную хвілю і зьнішчыць бальшавіцкі рэжым у Расеі. Узнаемная унутраная грызьня бальшавіцкіх главароў лепш усяго сьведчыць аб хуткім канцы панаваньня бальшавіцкай „банды“, як акрэсьліў маскоўскі Урад амэрыканскі пасланнік у Парыжу ў сваей афіцыяльнай прамове.

N.

Пашырайце роднае слова!

Падавайце сьпіскі пад назовам: Беларускі Нацыянальны сьпісак!

ЗАКОН

аб Гмінных самаурадах.

СКАРОЧАНАЯ ВЫБАРКА З РАСПАРАДЖЭНЬНЯ ГЭНЭРАЛЬНАГА КАМІСАРА УСХОДНІХ ЗЯМЕЛЬ АБ ГМІННЫМ САМАУРАДЗЕ.

(Dz. Urz. Zarz. Cyw. Z. Wschodn. Nr. 21 z dn. 16 Jaździernika 1919 r. poz. 215).

Аб Гміне.

Гміна складаецца з шэрагу вёсак, асадаў, засьценкаў і хвальваркаў злучаных у адміністрацыйную адзінку. (§ 1) Гэтая адміністрацыйная гміна адначасна ёсьць тэрыторыяльнай адзінкай самаурадавай і асобай праўнай.

Аб сябрах гміны.

Сябрамі гміны з'яўляюцца асобы: 1) якія маюць у межах гміны нярухомасьць і жывуць у межах гміны прынамсі ужо 3 месяцы і 2) якія радзіліся у межах тэрыторыі, пад'уладнай Цывільнаму Упраўленьню Усходніх Зямель, або у межах Польскае Рэспублікі і пастаянна жывуць у межах гміны ня менш як 10 месяцаў. (Усе гэтыя асобы павінны быць грамадзянамі польскай Дзяржавы.

Правы і абавязкі сябраў гміны.

Сябры гміны маюць права: 1) карыстацца з установаў, прадпрыемстваў і маемасьці гміны згодна з абавязуючымі у гэтых справах правіламі; 2) прымаць удзел у гмінных выбарах і займаць пасады па выбару згодна з абавязуючымі законамі; 3) карыстацца у разе канечнай патрэбы з апекі гміны згодна з правіламі адпаведных законаў. (§ 11). Абавязкам сябры гміны ёсьць: 1) падпарадкоўвацца правілам і загадам гмінных уладаў; 2) аплата падаткаў і аплатаў гмінных і 3) Выконваньне іншых гмінных павіннасьцяў. (§ 13).

Межы дзеяльнасьці гміны.

Да дзеяльнасьці гміны належыць: 1) Упраўленьне маемасьці гміны а также яе даходамі і выдаткамі; 2) будова і утрымліваньне гмінных дарог, мастоў і пляцаў; 3) закладваньне і утрымліваньне гмінных сродкаў камунікацыі (напр.: стойка) 4) праводка і утрымліваньне вадаправодаў, каналізацыі, а такжа дастарчэньне гміне асьвятленьня і электрычнай энэргіі; 5) апека над жабракамі і беднымі, утварэньне і утрымліваньне дабрачынных установаў; 6) Ахова грамадзкага здароўя, закладываньне і утрымліваньне бальніцаў і санітарных установаў; 7) Закладываньне і утрымліваньне бойняў і рынкаў; 8) дастарчаньне жыўнасьці) (аправізацыя) жыхаром здаровых і танных памешканьняў; 9) руплівасьць аб развою месцовага земляробства, гандлю прамысловасьці і рамёслаў, а такжа спаўдзельняў (коопэрацыі) 10) Руплівасьць аб грамадзкай асьвеце, закладваньне і утрымліваньне школаў, бібліатэк, дамоў людовых і г. д. 11) Нагляд за грамадзкай маральнасьцю. (§ 15).

Аб гміннай радзе.

Гмінная Рада складаецца з Радных і сябраў гміннага Ураду (§ 16).

Рада гмінная ёсьць прадставіцелькай гміны, ворганам пастанаўляючым і кантрольным (§ 22).

Межы дзеяльнасьці гм. Рады.

Гмінная Рада: 1) Устанаўляе правілы упраўленьня і способы карыстаньня з маемасьці гміны і усялякіх установа і інстытуцыяў належачых да гміны, або падлегаючых яе упраўленьню; 2) Набывае, збывае і закладывае нярухомасьць гміны прымае запісы і адказы (дар) на яе карысьць, робіць пазычкі і лёкуець капіталы; 3) разгледае і зацьверджае бюджэт і выдаткі непрадбачаныя бюджэтам, а також робіць зьмены у бюджэце; 4) Устанаўляе падаткі і аплаты на карысьць гміны, 5) Зьмяняе натуральныя павіннасьці на грашовыя і наадварот; 6) Устанаўляе способы касаваньня гмінных належнасьцяў, спагнаньне якіх ёсьць немагчымым; 7) Устанаўляе пасады і разьмер аплаты іх з выняткам пасадаў, установленных Законамі; 8) Устанаўляе штаты гмінных працаўнікоў; 9) Устанаўляе аплату (таксу) за карыстаньне у межах гміны з грамадзкіх способаў камунікацыі (напр. стойкі). 10) Дазваляе на спыненьне судовых справаў, якія заведзены ад імя гміны, зацьверджае міровыя, якія канчаюць споры аб нерухомасьці або грашовых сумах, большых нормы, установленай праз гмінную Раду; 11) надае пачэснае (гонорове) грамадзянства; 12) Дае сваю апінію у справах зьмены граніцаў гміны; 13) Кантралюе дзеяльнасьць Ураду гміны і яго рахунковасьць; 14) выбірае сябраў гміннага ураду (§ 22). Апрыч таго, гм. Рада мае права выдаваць мясцовыя абавязуючыя правілы у справах, падлегаючых яе вырашэньню Правілы гэтыя павінны быць зацьверджаны старостам. (§ 23) Гмінная Рада можа даручаць разгляд справаў спэцыяльным Камісіям як з радных гміны так і з асобаў не уваходзячых у склад радных а нат' сябраў гміны (§ 2).

Правы і абавязкі Радных.

Радныя і іх заступнікі выбіраюцца на 3 гады. (§ 17) Радны выбраны на сябру гміннага Ураду выходзіць з ліку радных і яго месца займае яго заступнік (§ 18). Радныя свае абавязкі выконваюць ганарова (бязплатна) (§ 19) Радны, які уступае у даговорныя стасункі з гмінай як арандатар, прадпрыемца, або пастаўшчык, ня можа выконваць абавязкаў раднага, аж да закончаньня з ім разрахунку па даговорам. (§ 20). Радны ня можа займаць платнай пасады

ФІНАНСЫ і ГАСПАДАРКА.

Крэдыты на адбудову зьнішчаных гаспадарак.

Ваявудзкія ўлады атрымалі паведамленьня, што у выніку згоды між міністрам скарбу і публічных работаў адкрыты крэдыт у рольным банку ў Вільні на карысьць адбудовы рольных гаспадарак, зьнішчаных у часе вайны. Крэдыт гэты дасягае мільёна зл. Ён будзе выдавацца ў першую чаргу на адбудову гаспадарак, якія знаходзяцца ў быўшай прыфрантовай паласе. Лік гэтакіх гаспадарак дасягае 4 000. Крэдыт гэты будзе выданы пад варункам будовы глінабітных гаспадарак. У зьвязку з гэтым у ваявудзтве адбудзецца конфэрэнцыя па пытаньню аб падзеле гэтых крэдытаў між паветамі.

Выдача тлумачэньняу плацельшчыкам падаткау

Міністэрства унутранных справаў выдала цыркуляр аб вызначэньні і ўзысканьні асобных камунікальных падаткаў, у якім між іншым гаворыцца, што незалежна ад правідловага састаўленьня платнічых наказаў камунальныя ўрады павінны выдаваць на жаданьня плацельшчыкаў неабходныя тлумачэньні, якія датычаць як праўнай падставы збора падатку, гэтак сама і спосабу устанаўленьня падаткавай належнасьці. Трэба даць магчымасьць плацельшчыкам падаткаў пазнаёміцца з адпаведнай ухвалаю (падатным статутам) і выканаўчымі прадпісаньнямі да яго, асабліва, калі плацельшчык ня мае магчымасьці пазнаёміцца на аснове апублікаваньня ўхвалы ці статуту (напрыклад з поваду ізразходаваньня выдаўніцтва, ў якім было апублікована і г. д.)

Плян апраўізацыі дзяржавы.

У пятніцу адбылося паседжаньне эканамічнага камітэту рады міністраў, на якім абгаварываўся плян пракармленьня дзяржавы на бягучы гаспадарчы год. Сутнасьць гэтага пляну выражаецца ў тым, што будзе значна абмяжованы выўаз збожжа. Вываз збожжа за граніцу будзе дазволены толькі пасьля таго, як унутры застаецца неабходная колькасьць для корму і насеньня.

Біржа.

Даляры	8,90—8,94 зл
Рублі зал.	4,62 зл
Рублі сяр.	— зл
Чырвонцы	32,— зл.

Збожжа

(*Віленшчына*)

Жыта (100 кілагр.)	— 53, зл.
Пшаніца „ „	60 — 63, зл.
Ячмень браваровы	.50— 53, зл.
Ячмень крупяны	.47 — зл.
Авёс „	.46— 47, зл.

Біаграфія Барыса Кавэрды

Барыс Кавэрда радзіўся у 1907 г. у віленскім павеце. Бацька яго быў гмінным пісарам ў Янішках, а матка вучыцелькаю У часе вайны сямейства Кавэрдаў выехала ў Самару, дзе Барыс паступіў да рэальнага вучылішча, кончыў першую і другую клясы. Пасьля вайны вярнуўся з маткаю і дзьвюмя малодшымі сёстрамі да Вільні і ў 1921 г. паступіў у віленскую гімназыю, у якой вучыўся да 7 клясы У верасьні 1925 г. перайшоў у 7 клясы гімназыі „Віленскага Рас. Т ва У канцы года перайшоў у 8 кл Яшчэ будучы ў беларускай гімназіі, Барыс Кавэрда працаваў у газ. „Грамадзкі Голас“ з самага яе пачатку, як экспэдытар, а пасьля ў нашай газэце „Беларускае Слова“, выпоўняючы абавязкі карэктара і экспэдытара. Быў вельмі здольны, памятлівы, скромны і выпаўняў свае абавязкі сумненна. Незначны заработак яго у газэце быў адзіным сродкам для падтрыманьня маткі і дзьвёх сясьцёр, якія вучацца ў Віленскай Беларускай Гімназыі Гэта праца аднімала ўвесь вольны час і вельмі шкадліва адбівалася на вучэньні.

Па славам вучыцялеў гімназыі Барыс Кавэрда рабіў уражэньня інтэлігэнтнага, скромнага, неацважнага, замкнутага і малаабшчыцельнага хлопца. Быў вельмі прыветлівы ў адносінах да адміністрацыі гімназыі, вучыцеляў і таварышаў. Ня меў за сабою ніякіх праступкаў нават вучнёўскіх.

Гэта сама і у газэтнай працы ён быў вельмі здольны і працавіты. Толькі ў апошні час пачаў паказваць адзнакі нэрвовасьці і раздражненьня. Першы раз дайшло да канфлікту з ім перад Вялікадням, калі замест усей месячнай пэнсыі яму было прапанавана 50 зл. наградных. Ен адмовіўся ад гэтай награды і некалькі дзён не зьяўляўся да рэдакцыі. Нарэшце зьявіўся 22 траўня да Старшыні Нац. Рады і папрасіўся на 4 дні ў отпуск. А свайму заступніку сказаў, што можа ня вернецца ў працягу двух тыдняў. Гэтак сама і матцы не сказаў на які час выезджае. Сказаў толькі пры разьвітаньні, што едзе да Горадні і быў вельмі нэрвовы. Як выехаў 22 траўня, дык да замаху на Вайкова аб ім ня было ніякіх чутак. Былі два дапушчэньні: адно — што ён легальна ці нелягальна выехаў да Радавай Расеі, аб чым ён хлапатаў яшчэ раней, а другое — што выехаў можа да Прагі, з якой падтрымліваў духоўны контакт, цікавячыся эсэраўскай расейскай, асабліва эміграntскай літэратуратураю

Вестка аб замаху на асобу Войкава паразіла усіх, знаўшых Барыса Кавэрду, як громам, бо ніхто ня мог лічыць, што Барыс Кавэрда адважыцца на гэткія рашучыя дзейства, тым балей, што ён увесь час быў пад прэсыяй матэрыяльнай патрэбы. Апрача гэтага ён ніколі ня выказываў прыхільнасьці да палітычнай працы, хаця ня скрываў свайго абурэньня проці бальшавіцкага рэжыму у Расеі. Варшаўскія газэты паведамляюць, што Б. Кавэрда на дапросе заявіў, што замах зьявіўся вынікам помсты, дзеля таго, што Войкаў адмовіў яму у выдачы пашпарта на ўезд у Радавую Расею Пасьля гэтага ў Б. Кавэрды пасьпеў плян забойства Войкава. Ен бачыў Войкава 3 чэрвеня і ужо тады жадаў выпаўніць свой плян, але адлажыў да больш адпаведнага мамэнту, прачытаўшы ў газ „За Свабоду“, што Войкаў мае замер выехаць у Маскву. Дзеля гэтага ў працягу 3 апошніх дзён хадзіў на вакзал, пакуль не спаткаў Войкава і не выпаўніў свайго пляну.



БАРЫС КАВЭРДА.

Грамадзяне-беларусы!

Не выбірайце партыйцаў! Заместа працы яны на паседжаньнях гмінных Радаў будуць займацца спрэчкамі, дыгрызьнёй!

Сяляне Беларусы!

Усе—на выбары у гмінны самаурад! Далоу партыйніцтва і палітыканства! Выбары павінны ісьці пад сьцягам нацыянальным!

Галасы прэсы.

Уся польская прэса асудзіла тэррорыстычны акт Барыса Кавэрды. Віленскае „Słowo“ пасьля забойства Войкава пісала:

> Учора на галоўным вакзале ў Варшаве згінуў ад рукі палітычнага забойцы п. Войкаў. дыплёматычны прадстаўнік С.С.Р.Р. у Польшчы. Німа ў Польшчы газэты, німа грамадзяніна, які-бы ня чуў прыкрасьці і болі, што гэтак трагічна на нашай тэррыторыі згубіў жыцьцё дыплёмата, над якога небясьпекаю бязупынна сачыла польская паліцыя. Але радавае пасольства часта выкручывалася з пад гэтай апекі, якая ўціскала яго. Прыклад Швэйцарскі прабываньня бальшавіцкай дэлегацыі ў Жэнэве паказывае, што бальшавіцкія дыплёмацы лічаць абразаю для сваей годнасьці нават заботлівую паліцэйскую апеку.
>
> Пасланнік Войкаў не паведаміў службы бесьпячэнства, што едзе на вакзал. Войкаў чуў сябе небясьпечна ў Варшаве, хаця знаў, што жыве там шмат быўшых расейскіх афіцэраў і наагул расейскіх эміграntаў, а ён, Войкаў браў некалі удзел у забойстве цара Мікалая, яго жонкі, яго дачок, з якіх тры былі яшчэ малалетнія, а яго сына — калеку. Войкаў асабіста быў чалавекам адважным, як паказала апісаньне забойства але ненавісьць і жаданьне помсты за часы чрэзвычайкі гэтак сама узбраяюць людзей ў адвагу безнадзеі.
>
> Ня ёсьць заслугаю Польшчы і Палякаў, што ніхто не страляе на прадстаўнікоў Францыі, Нямеччыны і Англіі, і ня вінавата Польшча ці Палякі ў тым, што расейскія патрыёты з крыкам „згінь за Расею“ мардуюць прадстаўнікоў С. С. Р Р.
>
> Зусім інакш разумее свае абавязкі радавы ўрад. Ен акружае нятолькі польскіх дыплёматаў, але ўсіх палакаў, прыежджаючых да Масквы, чулым пільнаваньнем аднак жа здараліся выпадкі мардаваньня нашых урадаўцаў бяз раскрыцьця забойцаў, як пакойнага Фронцкевіча. Не гаворым ужо аб тым, што забойства з за вугла наагул прапануецца арганамі бальшавіцкай партыі, як лепшы сродак прапаганды.
>
> Мэтады забойстваў з-за вугла і надпаляньняў, практыкуемыя ў нас Грамадаю, інстытуцыяй, кіраванай з Масквы. Яўны тэррор, дывэрсыйных бандаў, высылаўшыхся радавымі уладамі на нашу тэрыторыю. Ніхто ня пэўны, што камінтэрн які фінансова падтрымліваецца урадам С. С. Р. Р. ня ўзарве у паветра якога-небудзь парахавога складу..

* * *

Бальшавіцкія „Ізвесьця пішуць:

> Як, пасьля ультыматума Кэрзона, стаўся ахвяраю атмасфэры нападак адносна С. С Р. Р. Вароўскі, гэтак сама і цяпер Войкаў згінуў ахвяраю атмасфэры, створанай дзякуючы разрыву англійска-радавых адносінаў, якія наступілі з ініцыатывы Лёндана. Гэтак сама польскі ўрад нясе адказнасьць за гэта праступленьне, дзеля таго, што ня гледзячы на катэгарычнае жаданьне радавага ўраду ліквідаваць элемэнты белай гвардыі, знаходзячайся у Польшчы, польскі ўрад заўсёды цярпеў гэту дзейнасьць.

* * *

Англійскія газэты прынялі з лёгкаю іроніяй фантастычныя прадпалажэньні, выражанныя ў радавай ноце, якія прадбачаць істнаваньне тэррорыстычнага антырадавага загавору, выходзячага з Англіі.

* * *

Парыжская прэса абгаварываючы забойства Вайкова, рэзка выступае проці бальшавікоў. „Le Ganlois“ піша:

> Эўропа павінна даць бальшавікам зразумець, што ня будзе зносіць авантуры антыпольскага наступленьня.

„L'Oeuvre“ піша:

> Бальшавікі не павінны уваскрашаць Сараева і належыць ім зараз-жа напомніць, што мыляцца, калі думаюць, што ім удасца высяліць з Эўропы расейскіх эміграntаў антыбальшавікоў.

„Echo de Paris“ піша:

> За крываваю вывяскаю Радавай Расеі жыве яшчэ запраўдная Расея, чакаючая свайго адраджэньня. Бальшавіцкая ўлада закончыцца гэтак сама, як пачалася—у крыві і зьнішчажэньні.

Апошнія навіны.

З Польшчы.

Выбух парахавога склада ў Кракаве.

У понядзелак 6 чэрвеня ў Кракаве здарылася страшная катастрофа: выляцеў у паветра парахавы склеп, распаложаны ў 6 кілямэтрах ад горада. Першы выбух здарыўся у 10 гадзіне 20 мінут раніцы, калі большасьць насяленьня знаходзілася ў кась-

у гміне, а урадовец гмінны выбраны у Радныя — павінен адмовіцца ад пасады на увесь час выконваньня абавязкаў раднага. (§ 21). Радныя павінны прымаць удзел у паседжаньнях Рады, скліканых войтам. За неяўку на паседжаньне, без аб'ясьненьня повадаў — Радны можа быць аштрафованы (§ 30 і 31). Радны ня можа прымаць удзелу у паседжаньні Рады пад час разглядываньня справы, у якой ен сам, або радня ці сваякі яго першых трох ступеняў матэрыяльна заінтэрэсаваны (§ 29).

Аб паседжаньнях Рады.

На паседжаньнях Рады Старшынёй ёсьць войт (§ 25) паседжаньне склікае войт прынамсі раз у 3 месяцы з падачай парадку дня. Рада склікаецца і на жаданьне Ураду гміны або $1/4$ часьці сябраў Рады. (§ 26). Паседжаньні адбываюцца яўна. На жаданьне Старшыні, або $1/4$ прысутных, Рада большасьцю $2/3$ галасоў прысутных можа установіць тайнасьць паседжаньня. Аднак паседжаньні па разгледваньню бюджэту і рахунковасьці гміны павінны быць яўнымі (§ 27). Радны за нарушэньне парадкаў нарадаў па прапазыку старшыні і па пастанове Рады прынятай большасьцю $2/3$ галасоў прысутных, можа быць выключаны на 1 да 3 паседжаньняў. (§ 28). Калі не адбудзецца вызначанае паседжаньне за неяўкай падробнага ліку Радных,—вызначаецца другое паседжаньне з тым-жа парадкам дзённым. Гэтае паседжаньне ёсьць правамоцным пры кожнам ліку сябраў (§ 31). Пастановы аб пазычцы, або прадажы нярухомасьці павінны быць прыняты толькі на паседжаньні, на якім ёсьць прысутных ня менш $2/3$ усіх Радных. Усе іншыя пастановы прымаюцца пры прысутнасьці звычайнай большасьці (§ 32). Пастановы, датыкаючыя нярухомасьці, даўгоў прымаюцца большасьцю $2/3$ галасоў. Усе іншыя звычайнай большасьцю. У разе роўнасьці галасоў — пераважае голас старшыні. (§ 33) Галасаваньне адбываецца яўна. Аднак у справах асабістых, або на жаданьне $1/4$ часьці прысутных можа быць устаноўлена тайнае ці імённае галасаваньне. Пры выбарах — галасаваньне тайнае (§ 34) На кожным паседжаньні вядзецца пратакал (§ 35). Копіі пастаноўаў прадстаўляюцца у Староства (§ 36) Пастановы у справах паказаных у пунктах 2, 3, 4, 5, 6 і 9 § 22 — павінны быць зацьверджаны надзорчай уладай (Староства) (§ 37). Пастанова праводзіцца у жыцьцё калі надзорчая ўлада у працягу 2-х тыдняў ад атрыманьня зьместу пастановы не адмовіць яе зацьвердзіць, альбо не скасуець яе. (§ 38).

Гмінны Урад.

Гмінны Урад складаецца з войта, яго заступніка і аднаго лаўніка (§ 39) Яны выбіраюцца гміннай радай на 3 годы з асобаў якія: 1) маюць права быць выбраннымі у якую-колечы месцовую ці гмінную раду на тэрыторыі Усходніх зямель або Польшчы і 2) ёсьць сябрамі якой-колечы гміны гарадзкой, мястэчковай аба сельскай Усходніх Зямель ці Польшчы (§ 40) Апрача таго войт і яго заступнік павінны быць пісьменнымі. Выбары войта і яго заступніка павінны быць зацьверджаны Надзорчай Уладай І інстанцыі (староства). У разе незацьверджаньня выбраных—даконываюпца новыя выбары. Калі выбраны на нова войт ізноў ня будзе зацьверджаны Уладамі — Надзорчая Улада І інстанцыі вызначае войта або яго заступніка, якія урадуюць пакуль ня будзе зацьверджаны выбраны праз Радных кандыдат. (§ 41) Калі рада наагул не выбірае войта і яго заступніка, або адкладвае іх выбар—улады загадваюць зрабіць выбары у назначаны тэрмін. Калі-ж і на гэты раз выбары не адбудуцца—Улады вызначаюць войта ці яго заступніка на 1 год. (§ 42).

Войт і яго заступнік прысягаюць перад старостам (§ 43).Лаўніка выбіраюць Радныя з пасярод сябраў гміны, маючых права быць выбранымі у Радныя, на 3 гады. (§ 45) У выпадку звальненьня пасады войта ці яго заступніка да канца тэрміну іх урадаваньня,— Радныя дадаткова вібіраюць кандыдата на зволненую пасаду. Ен урадуе да канца тэрміну урадаваньня свайго папярэдніка (§ 46) Войт атрымлівае сталую пэнсыю з касы гміны у разьмеры, устаноўленым Радай Гміннай, аднак ня менш нормы, устаноўленай ваяводзтвам (§ 48). Заступнік войта атрымлівае плату толькі за абавязкі, якія ён выконвае за войта. Аднак Рада гмінная можа вызначыць яму і сталую пэнсыю. (§ 49). Сябры гміннага Ураду могуць трэбаваць звароту выдаткаў, якія яны маюць пры урадаваньні. Нормы гэткага звароту устанаўляе ваяводзтва (§ 50) Сябрам Ураду гміннага дае отпускі Надзорчая Улада (§ 51).

Межы дзеяльнасьці гміннага Ураду.

Урад гмінны ёсьць ворган упраўляючы. Да яго належыць: 1) Падгатоўка пастановаў гміннай Рады; 2) Акрэсьленьне спосабаў выкананьня пастановаў Рады; 3) Упраўленьне маемасьцяй гміны і інвэнтаром; 4) вядзеньне гмінных прадпрыемстваў; 5) Складаньне праэкту гміннага бюджэту; 6) укладаньне гадавой справаздачы з рахункoвасьці; 7) упраўленьне даходамі гміны; 8) разкладка падаткаў і гмінных павіннасьцяў згодна з законамі і пастановамі гміннай Рады, а такжа выдаваньне загадаў аб іх спагнаньні. 9) Нагляд над рахунковасьцяй і касай гміны; 10) вядзеньне судовых справаў гміны; 11) вызначэньне працаўнікоў і даваньне ім отпускаў; 12) справаздача Радзе гміннай: а) з сваёй дзеяльнасьці, а такжа і дзеяльнасьці падуладных органаў; в) з выкананьня Бюджэту і с) з палажэньня справаў маемасьці і гмінных установаў; 13) складаньне гміннай Рады прапазык датычна гміннай гаспадаркі (§ 55). Гмінны Урад мае дысцыплінарную уладу над працаўнікамі гміны. Урад можа накладаць на іх кары: 1) напамненьне, 2) выгавар, 3) штраф да 50 марок (цяпер зл.) 4) перавод на ніжэйшая пасады 5) звольніць з пасады (§ 56) Дакумэнты па якім гміна прымае пэўныя забавязаньні павінны быць падпісаны войтам і адным з сябраў ураду (§ 58). На дзеяльнасьць Ураду грамадзяне маюць права прынасіць жалабы гміннай Радзе (§ 59).

(*Працяг будзе*)

цёлах. З прычыны выбуху павылятаі усе шыбы у касьцёлах, раніўшыя многіх з малішыхся. Гэтак сама павылятаі шыбы амаль ні ва усіх дамах у месьце. У першы момэнт апанаваў усімі страшны перапалох. Усе думалі, што гэта землятрасеньне і павыбегалі на вуліцы. Выбухшы парахавы склеп быў абнесян зямляным валам вышынёю у 6 мэтраў. Толькі дзякуючы гэтаму дэтанацыя аказалася меньшаю і менш катастрафічнаю, чым магла быць, бо паветраны націск скіраваўся у гару. Ня гледзячы на гэта ў ва усіх акружаючых вёсках былі зарваны ўсе дахі. Выбухла 15 вагонаў бяздымнага пораху. На месьце быўшага парахавога складу засталася вялізарная яма, засыпаная грузам і абломкамі амуніцыі. Прычынай выбуху быў разклад выбуховага матэр'ялу, а ласьне бяздымнага пораху, у якім адбываліся, пад уплывам зьмены тэмпэратуры паветра, хімічныя працэсы. Ранена каля 486 асобаў, сярод якіх 130 аказана лекарская помач ў гмінах і 353 у кракаўскіх шпіталях. Найбольш пацярпелі дзеці, знахадзіўшыяся на лячэньні у шпіталі. Цяжка ранены 35, з іх 18 дзяцей, усе амаль ранены асколкамі шкла ў вочы. Адзін жаўнер, стаяўшы на варце, забіты. Сатрасеньне паветра было такое моцнае, што ў цэнтры Кракава ў памешканьнях людзі пападалі з крэслаў а мэбля паперавварачывалася. Але найбольш пацярпелі касьцёлы. Матэр'яльны урон абрахованы у 1,270,000 зл. Вартасьць выбітых у Кракаве шыбаў абрахована у 1 мільён злотых. На места катастрофы прыбылі з Варшавы віцэ-прэм'ер Бартэль. Урад на экстраным паседжаньні асыгнаваў 500,000 зл. на аказаньне першай запамогі ахвярам катастрофы.

З заграніцы.

Албанска-сэрбскі канфлікт.

Разрыў дыплёматычных адносін між Юга-Славіяй і Албаніяй з-за арышта албанскімі ўладамі сэкрэтара сэрбскага пасольства ў Тыране Юраскевіча ўсё больш абвастраецца. У белградзкіх палітычных сфэрах сачаць за разьвіцьцем падзеяў з вялікім непакоям. Апазыцыйная прэса жадае адстаўкі кабінэта. Афіцыяльная прэса адмечае, што канфлікт носіць паважны характар. Паводле вестак з Белграда значныя ваенныя часьці перакінуты на албанскую і італьянскую граніцу. Сэрбскім ваенным параходам загадана вярнуцца да портаў. У цэлым пагранічным раёне аб'яўляна асаднае палажэньне. Албанскі Ўрад зьвярнуўся да Лігі Народаў з просьбаю ўмяшацца ў канфлікт між Албаніяй і Юга-Славіяй. З Лёндана паведамляюць, што англійскія пасланнікі ў Юга Славіі і Албаніі атрымалі інструкцыі прыняць усе сродкі да таго, каб уладзіць албанска-сэрбскі канфлікт. Гэткія-ж інструкцыі атрымалі пасланнікі Італіі і Францыі. Італія пакуль займае нэйтральнае становішча у албанска-сэрбскім канфлікце.

АРЫШТ РАДАВАГА ПАСЛАННІКА У МЭКСЫЦЫ КАЛАНТАЙ.

У чэсьць бальшавіцкага пасланніка жанчыны ў Мэксыцы Калантай быў зроблены банкет. Паліцыя, падазраваючы, што ў памешканьні, дзе адбываўся банкет, адбываецца тайная каталіцкая імша, ўвайшла да памешканьня і арыштавала усіх прысутных у тым ліку і Калантай, якая была звольнена толькі пасьля доўгіх перагавораў. Аднакжа гэты выпадак зрабіў гэтакае моцнае уражэньне на Калантай, што яна раптоўна выехала з Мэксыкі у отпуск да Нямеччыны.

Баі у Кітаі.

Пасьля 30 гадзіннага бою войска Чанг-Кай-Шэка занялі Гун Чэнг, прымусіўшы войска правінцыі Шан-Тунга адступіць на лінію Сін-Чэнга.

Аб'яўленьне тэррора у С.С.Р.Р.

9 чэрвеня адбылося надзвычайнае паседжаньне калегіи усерасейскай чрэзвычайкі, на якім абгаварывалісь сродкі, якія будуць прыняты у зьвязку з апошнімі замахамі у Петраградзе і Менску. Калегія вынясла пастанову аб неабходнасьці аб'яўленьня тэррору у С. С. Р. Р. для барацьбы з „контр-рэвалюцыянэрамі" і для першага запалоханьня тэррарыстаў засудзіла на сьмертную казьнь 20 арыштаваных у турмах. Прыгавар зараз-жа быў выкананы.

Замах з бомбамі у Петраградзе.

З Петраграда паведамляюць, што 7 чэрвеня позна вечарам нявыясьненыя асобы кінулі бомбу ў памешканьне дыскусыйнага клюбу камуністычнай партыі, дзе адбывалася паседжаньне сяброў клюбу. Безпасрэдня за гэтым замахам была кінута новая бомба, выбух якой зрабіў зьнішчэньня ў клюбе, цяжка раніўшы 26 асобаў і некалькі лягчэй. Замахоўцы ўцяклі, адстрэліваючысь і ня былі злоўлены.

Шалеюць.

Тэл. агенства „Union" паведамляе з Масквы, што бальшавіцкія ўлады зрабілі масавыя арышты ў Харкаве, Мікалаеве і Адэсе. Між іншымі арыштавана шмат іностранцаў.

АСАДНАЕ ПАЛАЖЕНЬНЕ НА БЕЛАРУСІ.

Бэрлінскія газэты паведамляюць, што ў менскім раёне Усходняй Беларусі аб'яўлена асаднае палажэньне. На карацельны атрад чрэзвычайкі і конную сотню напалі поўстанцы каля в. Мушыны. Карацельны атрад, спатканы пулямётным агнём паўстанцаў адступіў, згубіўшы 30 чал.

ЗАМАХ НА СТАРШЫНЮ Г. П. У. У МЕНСКУ.

На старшыню менскай чрэзвычайкі Апенскага зроблен замах. Апенскі выехаў на дрызіне з Менску і ў некалькі кілёмэтрах ад места дрызіна з прычыны умысльна сапсутага шляху скацілася з насыпі. Шафэр убіўся на месьці, а Апенскі ў няпрытомным стане дастаўлен у менскую бальніцу, дзе хутка і памер.

Тутэйшая хроніка.

— ПАЕЗДКА ДА ВАРШАВЫ П. ВАЯВОДЫ РАЧКЕВІЧА. У суботу вярнуўся з Варшавы п. ваявода Рачкевіч, ездзіўшы па справам, зьвязаным з выбарамі да самаўрадаў і ўрачыстасьці каранацыі Маткі Божай Астрабрамскай.

— Звальненьне з турмы на Антокалі гэн. Загурскага. У панядзелак 6 чэрвеня быў звольняны з ваеннай турмы на Антокалі гэн. Загурскі, арыштаваны ў мінуўшым годзе пасьля маёвага перавароту за тое, што загадаў скідаць бомбы з аэрапляну на Варшаву ў часе збройнага выступленьня маршалка Пілсудскага.

— ВОДГУКІ ЗАБОЙСТВА ВОЙКАВА. У Вільню прыяжджалі дэлегаваныя цэнтральнымі уладамі з Варшавы, пракурор Сьвянткоўскі і сьледавацель па важнейшым пытаньням Скаржынскі. Яны дапрашывалі цэлы рад асобаў, меўшых якія-небудзь адносіны да Кавэрды—як яго матку, таварышаў, дырэктара гімназіі Белеўскага, Падбярэскага і іншых. У суботу п. Скаржынскі і Сьвянкоўскі выехалі да Варшавы.

— АДВАКАТ АНДРЭЕЎ — АБАРОНЦА Б. КАВЭРДЫ. Матка Б. Кавэрды зьвярнулася да адваката П. Андрэева з просьбаю прыняць на сябе абарону ў судзе яе сына. П. Андрэеў згадзіўся на гэта, адмовіўшыся ад ганарару.

Нашыя літэратурныя юбілеі.

Сёлетні 1927 год сапраўды можам назваць юбілейным для беларускай літэратуры; ўжо самы яго пачатак прынёс іх гэтулькі, што на'т трудна было ушанаваць належна кожны з іх

Гэтак 26 лютага гэтага году мінула 5 гадоў са дня сьмерці найлепшага беларускага новэліста *Ядвігіна Ш.* (Антона Лявіцкага); 12-га сакавіка бягучага году прайшло 40 гадоў з дня нарадзін вядомага песьняра беларускага, рэвалюцыянэра і філязофа—*Алеся Гаруна* (Александра Прушынскага), памершага у 1920 г. ад крываўкі у Кракове; і зноў-жа 6-га мая бягучага году мінулі першыя угодкі са дня сьмерці, перадчасна згінуўшага ад сухотаў *К. Сваяка* (кс. Казіміра Стэповіча), выдатнага беларускага несьняра імпрэсыяністычнага напрамку найбольш мейсца у сваей творчасьці прысьвячаючага тэмам рэлігійным і нацыянальным; урэшце 25-га траўня мелі мейсца 10тыя угодкі са дня сьмерці беларускай адраджонай літэратуры *Максіма Багдановіча.* Гэтымі ўгодкамі канчаецца цыкль беларускіх літэратурных юбілеяў першае паловы 1927 году.

Я. С.

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

Беларускае Сьвята.

Навагрудак 2 чэрвеня.

Сяньня тут адбылося ўрачыстае адкрыцьце дзьвёх бурсаў — мужчынскай і жаноцкай при беларускай гімназіі. Урачыстасьць гэта тым балей заслугуе на ўвагу, што азначае паваротны пункт у польска-беларускіх адносінах, якія пасьля разгрому Грамады начынаюць паволі палепшацца. Урад пачаў больш звяртаць увагу на патрэбы беларускага крэсавага жыцьця, як матэр'яльныя, гэтак сама і культурна-асьветовыя. Лепшым доказам гэтага звароту ў дзяржаўнай палітыцы адносна беларусаў зьяўляюцца тыя крокі, якія зрабіў урад для падтрыманьня нашае гімназіі.

Адчыняныя бурсы паўсталі галоўным чынам дзякуючы ініцыятыве пана Ваяводы, якога узрушыла цяжкое матэр'яльное палажэньне нашае Гімназіі. Пан Ваявода выстараўся сталай запамогі для Гімназіі, стварыў вучыцельскія пасады і нарэшце здабыў сродкі для дзьвёх бурсаў, даўшы магчымасьць спакойна вучыцца бяднейшым беларускім дзецям на карысьць свеей бацькаўшчыны Беларусі і старэйшай сястры Польшчы.

Пан Ваявода з вышэйшымі урадоўцамі ваяводзтва прыбыў найперш да жаноцкай бурсы на Перасьце, дзе паважаных гасьцей павітала у беларускай мове вучаніца М. Бедзеўская, прапанаваўшая п. Ваяводзе букет кветак. Пасьля кароткай імшы і асьвяшчэньня жаноцкай бурсы, як я пакуль можа утрымаць 18 вучаніцаў, усе прысутныя скіраваліся да Брэцянак у 3 кілёмэтрах ад места, дзе знаходзіцца мужчынская бурса для 34 пансіёнэраў пад асабістаю апекаю дырэктара гімназіі Скрэбца. Пана Ваяводу прывітаў па беларуску гімназіста Варановіч, выказаўшы шчырую і гарачую падзяку за прыхільныя адносіны да лёсу гімназіі.

Пасля імшы і асьвяшчэньня адбылася ўрачыстасьць, на якой выступала моладзь з уласнымімі творамі, а хор сьпеяў нацыянальныя гімны польскі, беларускі і некалькі беларускіх песьняў. Пасьля прамовы п. Бабкоўскага ад імя бацькаўскага камітэту выступіў з дакладам аб фінансавых запамогах п. Ваяводы Дырэктар Гімназіі п. Скрэбец, закончыўшы сваю прамову па польскі і падтрыманы усею забраўшаюся моладзьзю і іх бацькамі у чэсьць Польскай Рэспублікі і Яе прадстаўніка п. Ваяводы. Наступны аратар вучыцель п. Чатырка гаварыў аб зьбліжэньні дзьвёх культураў, з якіх старэйшая — польская дала сяньня доказ, што ўмее шчыра апекавацца сваею малодшаю сястрой Закончыў указаньнем на запамогу п. Ваяводы, як матэр'яльную, гэтак і маральную, з якіх другая мае для беларускага народу значна большае значэньне і стварае гарачых патрыётаў супольнай і дарагой Бацькаўшчыны.

У канцы п. Ваявода падзякаваў сабраўшымся за шчыры прыём, пажадаўшы моладзі пасьпеха ў вучэньні і працы над культурным разьвіцьцем свеей Бацькаўшчыны. Выразіў надзею, што ў будучыне будуць добрымі грамадзянамі Дзяржавы і ня перастануць з гонарам падтрымліваць і разьвіваць сваю культуру. П. Ваявода запэўніў бацькаўскі камітэт, што і дальш будзе апекавацца як гімназіяй, гэтак сама і нова адкрытымі бурсамі.

—а

Пісьмо у рэдакцыю.

Паважаны Пане Рэдактар!

Не адмоўце надрукаваць у Вашай газэце ніжэйідучае.

У Nr. „Нашай Праўды" п. Антон Луцкевіч, адказваючы на закіды пасла Рагулі між іншым кажа, што ён формы для беларускага войска не зацьвярджываў. У імя справядлівасьці мушу цьвердзіць, што ўласьне і ёсьць так — п. Антон Луцкевіч ніякай формы не зацьверджываў і ваогул да фармаваньня беларускіх аддзелаў пад Польшай адносіўся няпрыхільна.

Але ў 1919 г. ў Варшаве, калі я апрацовываў праэкты гэнае формы, то праўда не аднаразова радзіўся з п. Луцкевічам і радзіўся толькі у сэнсе нацыянальных адзнакаў формы, сама-ж форма была зацьверджана тагачасным Міністрам Вайсковых Спраў Гэнэралам Сосенкоўскім.

Г. Канапацкі.

Паштовая скрынка.

Людвік Фуксу— Карацк Газэта высылаецца акуратна. Спраўцеся на пошце.

С. Белайцу — Мін. Высылаем Вам № 17. Там часткова азнаёміцеся з працамі Б Н, Р Адрэс рэд. „Віл Утра": Вільня Віленская, 25, п. 10.

Рускі Замежны Архіў — Нумары ад 7 — 17 улучна выслалі як і Досьвіткі

М. Ульянчыку. М. Татарчуку, М. Цемнякову, В. Кавальчыку, Ар Грынкевічу, Я. Багрыму, Ан Карабачу, Ат. Лабану. Л. Гагалушко, Я. Лабану, Р. Гагалушко, В. Чыжыку, М. Багрыну, В. Венскаму, Хв Кошкіну, М Гагалушко, Я Янчэўскаму, Ѕы. Волкаву, Б Плецкаму, Г. Сопку, Р. Бураку, В. і Г. Кавальчыкам, А і Б Сіняку, Т. Сербіну, М. Кухце, К. Хадзінскаму, Ст. Качуку, Ан Семашкевічу, М. Касьцюку, М. Неставуку Ал. Кардашу, Ул Казьяну ул. Ракевічу і Ал. Патоцкаму *пробныя нумары выслалі.*

Лякс. Радзецкаму— Два злот. атрымалі. Газэту высылаем.

Яз. Бабыру— „Досьвіткі" і газэту высылаем як усім.

Паўлоўскаму Бронісл. — Рэдакцыя ня можа вам нічога парадзіць, бо аб заработках у Аргэнтыне рэдка хто знае.

Клецкая Беларуская Гімназія

Прыймовыя экзамены ў канцы бягучага году адбудуцца ў днях:
ў I кл. — 23, 24 і 25 чэрвеня
ў II, III, IV, V, VI і VII кл. — 27, 28 і 29 чэрвеня.

Заявы прымаюцца ў Канцэлярыі Гімназіі (м. Клецк, Нясьвіскага пав., 2 Татарская вул. № 4).

Да заявы трэба далучыць:
1. Мэтрыку аб нараджэньні вучня.
2. Пасьведчаньне аб адукацыі.
3. Пасьведчаньне аб прышчэпе воспы.

ДЫРЭКЦЫЯ.

КАЛІ ТРЭБА ПАЧЫНАЦЬ АПРАЦОЎКУ ЗЯМЛІ НА ВЯСНУ.

Кожны земляроб павінен знаць характар свайго грунту і ужо з практыкі знаць калі пачынаць апрацоўку. Пачынаць рана блага, бо зямля можа быць яшчэ зьмершы а спазьніцца таксама блага, бо зямля вельмі высахне. Вясеннія вятры і сонца вельмі хутка высушаюць рольлю; вада хутка выпаровывае і зямля перасохшы трэскаецца. Гаворым тутака аб зямлі зааранай на зіму, бо трэба памятаць, што у добрага гаспадара поля не астаецца на зіму незаараным. Моцна высушаная зямля трудна паддаецца опрацоўцы. Зацягіваецца тады яна цьвёрдым пластом ломіцца на кавалкі а потым пераціраецца у парашок, які ня можа схаваць у сабе зярнё а пасьля дажджу цьвярдзее і шкодзіць добраму усходу. Трэба асьцерагацца распыленьня зямлі бо яна праз гэта траціць свой добры характар. Кожнаму з земляробаў добра ведама як неабходнай для расьлінаў зьяўляецца вільгаць, асабліва вясной і ў пачатку лета бо пад канец лета найчасьцей бывае за шмат вільгаці, а вясной, зьяўляецца яе недахоп. Надзея на дажджы благая, бо яны спадаюць часта не тады калі іх трэба.

Дык вось у часе васеньняй слаты і зімавога сьнега у зямлю пападае шмат вільгаці, і гэтай вільгаці, якая зьбіраецца у зямлі посьля зімы можа на доўга хапіць толькі трэба яе добра захаваць. У непаруханай зямлі робіцца шмат дробных як валасок дзюрачак, праз якія вада з пад споду выходзе на верх зямлі і выпараецца у паветра Зямля мае здольнасць рабіць гэткія дзюрачкі заўседы, але найболі зьяўляецца іх вясной, калі зямля мае ў сабе шмат вады, а зьверху сонца суша зямлю і дзякуючы высыханьню робяцца шчэліны праз якія і выходзе вода. Каб не дапусьціць вільгаць вылятаць у паветра праз валасяныя дзюрачкі і праз шчэліны трэба падзёрці яе бараной каб іх засыпаць і гэткім чынам затрымаць вільгаць у зямлі. Умела парушаная зямля можа захаваць у сабе вільгаць на цэлае лета і можна уберагчыся гэткім спосабам бяды ад засухі. Звычайна земляробы не дацаняюць усяго значэньня вільгаці для ураджаю, дык вось вада зьяўляецца найважнейшым варункам для узросту расьліны. Бо калі ня хопіць вады для расьліны дык нічога не памогуць і штучныя дарагія гнаі Вада для расьліны зьяўляецца найнеабходнейшым і найдаражэйшым гноем. Расьлінам патрэбна яе заўседы, але найбольшая патрэба вады зьяўляецца у тую пару пакуль расьліна не запусьціла глубока у зямлю каранёў і апошнія не дасягаюць таго пласта зямлі дзе знаходзіцца болі вільгаці. З гэтай прычыны найболі небясьпечнымі зьяўляюцца засухі у канцы вясны і на пачатку лета, дажджоў жа ў гэтую пару замала; дзеля гэтага вільгаць што знаходзіцца пад зямлёй найболі цэніцца якую недбальствам мы усягды марнуем. Часта здараецца гэткі грэх земляроба, што калі зямля добра выглядае пасьля зімы, праз недагляд высыхае і вяне а земляроб мала зварачвае на гэта увагі і бярэцца за абработку, тады калі да астатняга высыхне, дарма тады ён дзярэ яе баронамі не палепшае яна, бо ужо страціла свой добры характар і свой неабходны клей, якім зьяўляецца вільгаць сярэдняя і ў прасушаную зямлю кідае зярнё, якому доўга трэба будзе чакаць пакуль пойдзе дождж і у канцы ураджай выходзе благі.

Дык вось першай вясеньняй работай на полі зьяўляецца баранаваньне заворанага восеняй поля. Гэтым баранаваньнем зробім тое аб чым мы ужо вышэй гаварылі: зьберажэм вільгаць у зямлі Апрача гэтага раньняе баранаваньне мае і другое значэньне. Баранаваньнем разбурываем тую скарынку зямлі праз якую не магло папасьць паветра у зямлю. Трэба памятаць, што першай работай зьяўляецца баранаваньне пазімавай ральлі, а пасьля ужо можна пачынаць і засеў.

Галасуйце на Беларускія Нацыянальныя сьпіскі!

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мастовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.